Койпіш А.С., студ. гр. 411 ФК і СКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Рэмішэўскі К.І.,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

# БЕЛАРУСКІ КІНАЛЕТАПІС І ДАКУМЕТАЛІСТЫКА Ў ПРАСТОРЫ BY.NET

Дзесяцігоддзі гісторыі кінадакументалістыкі паказваюць ўстойлівасць цікавасці і кінематаграфістаў, і гледачоў да навуковых даследаванняў, заснаваных на вывучэнні кінаматэрыялаў і іншых дакументах мінулага. На працягу значнай часткі гісторыі кінематографа – з моманта яго ўзнікнення ў 1895 годзе і па 1960-я гады хроніка (прэзентуемая, часцей за ўсё ў форме кіначасопісаў) ўсведамлялася гледачамі, як носьбіт безумоўнай экраннай карціны рэчаіснасці. Для саміх стваральнікаў кіналепісу догі час заставалася аксіёмай прыярытэтнасць функцыі менавіта кінадакументацыі. Але хранікальная «кінагісторыя» у сутыкненні з рэальнай гісторыяй людзей і падзей дэманструюць цікавую дыялектыку гэтых – ва многам супярэчлівых – форм прадстаўлення.

Шматзначнымі аказваюццаі палітычныя, і ідэалагічныя, і саціяльна-псіхалагічныя аспекты як выбара і фіксацыі рэальных фактаў сучаснай гісторыі, так і іх больш позняга ўспрымання гледачамі. Значная частка гэтых супярэчнасцей выклікана тым, што многімі даследчыкамі не ўлічваюцца функцыянальныя характарыстыкі кіналетапіснага матэрыяла як інфармацыйнага прадукта свайго часу.

У кінахроніцы і дакументальным кіно сустракаюцца шматлікія тэарэтычныя і практычныя пытанні асэнсавання мінулага мовай кінаэкрана, а таксама складанага комплексу мастацка-творчых аспектаў працы над творамі дадзенага жанрава-відавога напрамка. Разгляд хранікальнага матэрыялу ў кантэксце развіцця сучаснай навукі і ў якасці сродка захавання нацыянальнай памяці, а таксама своеасаблівага, непаўторнага і амаль што знікаюшчага творчага феномену дазваляе значна пашырыць магчымасці спазнання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэчаіснасці і ў пэўнай меры садзейнічаць абнаўленню гістарычнага мыслення пры вывучэнні мінулага [5, с. 17].

Менавіта кінахроніка і дакументалістыка з'яўляліся заўсёды самым поўным адлюстраваннем змены культурных цыклаў і сацыяльных пераваг, мыслення розных эпох і іх мастацкіх пошукаў.

Важна адзначыць, што кіналетапісны матэрыял, як правіла, з'яўляецца пленачным дакументам, што абумоўлена спосабам яго стварэння і захавання ў эпоху, калі не існавала тэхналогій відэазапісу, а тэлебачанне яшчэ не ўступіла ў фазу свойго росквіта.

Не выпадкова многія замежныя агенцтвы і архівы важныя падзеі, знятыя толькі на відэа, імкнуцца перавесці для наступнага захоўвання на кінаплёнку (тэрмін прадатнасці магнітнай плёнкі каля 10 год, у той час як кінаархівы даказалі – ва ўмовах якаснага захавання кінастужка можа захоўвацца амаль неабмежаваны час). Цяпер ужо распрацаваныя метады лічбавага кадзіравання дазваляюць захоўваць на належным узроўні і відэамалюнак, і гук. Таму мэтазгодным з’яўляецца превод аўдыёвізуальнага матэрыяла на лічбавы носьбіт. Аднак пакуль кошт гэтай вытворчасці не дазваляе яму ўкараніцца паўсюдна. І думаецца, што на памяці яшчэ не аднаго пакалення паняцце «архіўны матэрыял» будзе звязаны з адчуваннем ў руках кінастужкі.

Паказальным з'яўляецца той факт, што менавіта найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі на працягу апошняга дзесяцігоддзя занялі вядучае месца ў арсенале сродкаў, што выкарыстоўваюцца для стварэння інфармацыйных прадуктаў, арыентаваных і на досыць вузкі сегмент рынка, і на масавую аўдыторыю. Аднак, для адукацыйных, творчых і навукова-даследчых мэт мультымедыйныя прадукты маюць практычную каштоўнасць і, такім чынам, застаюцца запатрабаванымі мэтавай аўдыторыяй часцей за ўсё тады, калі падаюць спажыўцу прынцыпова новы змест. Гэта справядліва і для тых выпадкаў, калі новы змест сфарміраваны з фрагментаў твораў, створаных шмат дзесяцігоддзяў таму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Унікальная па свайму зместу беларуская кінахроніка, якая прадстаўляе несумненную навукова-даследчую і творча-эстэтычную каштоўнасць, практычна не прадстаўлена ў Інтэрнэт.

Улічваючы культурна-асветніцкае значэнне аўдыёвізуальнай інфармацыі, магчымасці яе далейшага шматразовага камерцыйнага выкарыстання, уяўляецца магчымым і мэтазгодным уключэнне беларускай кінохронікі і аўдыевізуальнага матэрыяла ў сусветную інфармацыйную прастору. Напрыклад, расійскі кіналетапіс знайшоў сваё адлюстраванне на прасторы Інтэрнэт у разнастаяных па якасці, стылістыцы і тэматыцы формах. На шматлікіх web-старонках прадстаўлены анталогіі, прысвечаныя падзеям гісторыі і культуры краіны: "Кинолетопись БАМа" [4],"Россия, которую мы сохранили" [6],“Военная кинохроника” [3], "Владимир Высоцкий: кинохроника" [7]. Акрамя таго ў расійскай Інтэрнэт-прасторы існуе лічбавы архіў дакументальных фільмаў і кінаперыёдыкі [1]. Сайт www.net-film.ru забяспечвае просты і зручны доступ шырокай прафесійнай аўдыторыі да архіўных кінаматэрыялаў, якія ахопліваюць перыяд з канца XIX стагоддзя да нашых дзён і асвятляюць гісторыю СССР, Расіі і іншых краін. На сайце ўжо размешчана каля 30 000 фрагментаў і апісанняў фільмаў на рускай і англійскай мовах.

Значную частку беларускай кінаспадчыны складаюць мастацкія, анімацыйныя, навукова-папулярныя і дакументальныя фільмы, кінаартыкулы, альманахі і кіначасопісы. Шмат цікавых дакументальных кадраў ўключана ў такія фільмы, як "Біяграфія маёй рэспублікі", "Штрыхі да партрэта", "Беларусь дарэвалюцыйная", "Старонкі гісторыі Мінска" і іншыя. У кіначасопісах "Савецкая Беларусь", "Навіны дня", "Мастацтва Беларусі", адлюстраваны многія значныя падзеі ў жыцці Беларусі [2]. Найбольш эфектыўнай стратэгіяй далучэння беларускага грамадства да аўдыёвізуальнай культурнай спадчыны краіны, прадстаўляецца ў паэтапным размяшчэнні ў вольным доступе ў прасторы by.net спачатку даведнікаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзроўні фондаў, затым на ўзроўні вопісаў, далей - на ўзроўні фрагментаў кіналетапіснага матэрыялу.

Такім чынам, з-за імклівага тэхналагічнага развіцця і цэлага шэрагу глабальных прамысловых, сацыяльных і інтэлектуальных трансфармацый, такіх як: ўніверсалізацыі глабальнай сеткі Інтэрнэт і паўсюднае выкарыстанне лічбавых носьбітаў, на рубяжы XX-XXI стагоддзяў сфарміраваўся істотная тэхналагічная і камунікацыйная дыстанцыя паміж экраннай спадчынай мінулага стагоддзя і сучаснымі прадуктамі мультымедыя, якія рэпрэзентуюцца ў прасторы Інтэрнэт. Таму даследаванне вопыту гісторыі кінахронікі, эвалюцыі сістэмы выкарыстання і рэпрэзентацыі аўдыявізуальных матэрыялаў, дынамікі прафесійных «кінаматэрыялаў», роўна як і сацыякультурнага кантэксту экраннай інфармацыі на ўзроўні дзяржаўнага ўздзеяння і індывідуальнай свядомасці, заслугоўваюць сёння як ніколі адмысловай увагі, вывучэння і аналізу.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1.Архіў дакументальных фільмаў і кінахронікі [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://net-film.ru. – Дата доступа: 23.02.2012.

2.Архіўныя даведнікі // Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=283279. – Дата доступа: 20.04.2012.

3.Ваенная кінахроніка [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://musvid.net/videocat/%E2%EE%E5%ED%ED%E0%FF+%EA%E8%ED%EE%F5%F0%EE%ED%E8%EA%E0/. – Дата доступа: 15.04.2012.

4.Кіналетапіс БАМа [Электронны рэсурс]. – 2008. – Рэжым доступа: http://rutracker.org/forum/viewtopic.php?t=2961334. – Дата доступа: 10.04.2012.

5.Малькова, Л.Ю. Сучаснасць як гісторыя. Рэалізацыя міфу ў дакументальным кіно / Л.Ю. Малькова. – Масква: Мацярык, 2001 – 188 с.

6.Россия, которую мы сохранили [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://rutube.ru/tracks/753448.html. – Дата доступа: 20.04.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7.Уладзімір Высоцкі: кінахроніка" [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://www.ozon.ru/context/detail/id/6839076/?item=4990206. – Дата доступа: 29.03.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ